УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3 (4Беи)я73
У68

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 11 ад 26.05.05 г.)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі *У. І. Навіцкі;*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У. В. Тугай*

*Складальнікі:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М. М. Забаўскі;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *У. С. Пуцік;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А. Ф. Рацько;*
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В. М. Фамін*

*Пад агульнай рэдакцыяй* А. П. Жытко

**Гісторыя** Беларусі перыяду капіталізму : вучэб. дапам. : У 5 ч. Ч. 1.
У68 Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі / склад. А. П. Жытко [і інш.]; пад агул. рэд А. П. Жытко. – Мн. : БДПУ, 2005. – 138 с.
ISBN-985-501-098-1.

У дапаможніку асвятляюцца найбольш важныя праблемы сацыяльна-аграрнай палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да сялянства і памешчыкаў Беларусі на этапе капіталізму.

Адрасаваны студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ, можа быць выкарыстаны навукоўцамі і выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 947.6(075.8)**
**ББК 63.3 (4Беи)я73**

**ISBN 985-501-098-1** (ч. 1)
**ISBN 985-501-083-3**

© Жытко, А. П. [і інш.], складанне, 2005
© БДПУ, 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

**Вучэбны дапаможнік**

**У пяці частках**

***Частка 1***

## *Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі*

ук 3115

Бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

давалі крэдыты пад залог зямлі і іншай нерухомасці. Але няздольнасць значнай часткі дваран-памешчыкаў адаптавацца да новых умоў, якія ўцягвалі іх у кругаверць рынкавых адносін, вымушала іх закладваць свае зямельныя маёмасці не для арганізацыі па-новаму сельскагаспадарчай вытворчасці, а для часовага атрымання грашовых сродкаў. У канцы канцоў іпатэчныя ўстановы спрыялі крысталізацыі памеснага дваранства. Тыя з іх, што не змаглі прыстасавацца да новай рэчаіснасці, закладвалі і страчвалі свае зямельныя ўладанні, а тая частка, што пераступіла праз сваю барскасць і ўлілася ў шэраг сельскіх прадпрымальнікаў, праз банкі атрымлівала пазыкі і арганізоўвала сельскагаспадарчую вытворчасць у адпаведнасці з часам.

*Падводзячы вынікі аналізу дваранскага землеўладання ў Беларусі на этапе капіталізму, неабходна адзначыць, што асноўныя працэсы, якія ў ім адбываліся ў гэтыя гады, па свайму характару адпавядалі агульнарасійскім. У прыватнасці, як увогуле ў Расіі, так і ў Беларусі адбывалася скарачэнне дваранскага і павелічэнне бессаслоўнага прыватнага землеўладання. Падала ўлада зямлі, павялічвалася ўлада грошай. Такім было ўздзеянне капіталізму на пазямельныя адносіны ў парэформеннай Расіі. Аднак у Беларусі гэты працэс у значнай ступені дэфарміраваўся і ўскладніўся ўмяшаннем царскага ўрада. Увядзенне абмежавальных законаў адносна набыцця зямлі дваранамі каталіцкага веравызнання пасля паўстання 1863–1864 гг. штучна стрымлівала працэс яе мабілізацыі. Гэта азначае, што праблема дваранскага землеўладання ў Паўночна-Заходнім краі з эканамічнай пераўтварылася ў палітычную. Галоўнай мэтай царскага ўрада з'яўлялася насаджэнне тут рускага (праваслаўнага) землеўладання ў процілегласць польскаму (каталіцкаму).*

*Урадавыя абмежаванні пазямельных адносін у краі сталі прычынай таго, што ў Беларусі дваранскае землеўладанне скарацілася ў гэты перыяд у меншых памерах, чым у цэлым па Еўрапейскай Расіі. Калі ў Расіі яно склала з 1877 да 1905 г. 27,2 %, дык у Беларусі толькі 10,6 %. У гэтым сказвалася і тое, што памешчыкі Беларусі больш павярхова пераводзілі сваю гаспадарку на капіталістычныя рэйкі. Аднак галоўным было ўмяшанне ўлады ў працэсы, якія павінны былі самі пракладваць дарогу ў дваранскім землеўладанні.*

*Асаблівасцю дваранскага землеўладання ў Беларусі парэформеннага перыяду з'яўлялася наяўнасць сервітутаў, цераспалосіцы, неакрэсленых адносін з асобнымі катэгорыямі сялянства. Гэта таксама стрымлівала працэс мабілізацыі зямлі, а разам з гэтым і развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Пераадоленне гэтых феадальных перажыткаў зацягнулася ў Беларусі не ў апошнюю чаргу з-за асобай*



*палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да дваранства каталіцкага веравызнання.*

*Стварэнне ў 80-я гг. дваранскага зямельнага банка і яго дзейнасць не ўнесла істотных змяненняў у працэс пераразмеркавання дваранскай зямлі, але надала яму больш цывілізаваны, уласцівы буржуазнаму грамадству, характар.*

## Тэсты

I. Размясціце ў правільнай паслядоўнасці ад большага да меншага. У 1865 г. у Мінскай губерні дваране-пмешчыкі па веравызнанні складалі %:
1) магаметане;
2) праваслаўныя;
3) лютэране;
4) католікі.

II. Закон аб забароне набыцця зямлі дваранамі-католікамі, акрамя як у спадчыну, быў прыняты:
1) 19 лютага 1861 г.;
2) 26 верасня 1862 г.;
3) 20 мая 1964 г.;
4) 10 снежня 1965 г.

III. 16 ліпеня 1845 г. быў прыняты закон:
1) аб забароне католікам набываць нерухомасць у гарадах Заходняга краю;
2) аб запаведных спадчынных уладаннях;
3) аб дазволе ўладальнікам секвестраваных маёнткаў прадаваць іх асобам рускага паходжання;
4) аб дазволе асобам рымска-каталіцкага веравызнання арандаваць землі ў Заходнім краі.

IV. Запаведнае спадчыннае ўладанне – гэта:
1) латыфундыя;
2) ферма;
3) майарат;
4) эканомія.

V. Да рэформы 1861 г. правам набыцця ва ўласнасць населеных земляў валодалі:
1) мяшчане;
2) купцы;
3) праваслаўныя святары;
4) патомныя дваране.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

VI. Перажыткамі феадальнай эпохі з'яўляліся:
1) цераспалосіца;
2) сервітуты;
3) майараты;
4) абшчына;
5) свабодная мабілізацыя зямельнай уласнасці.

VII. Размясціце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці:
1) передача права выдачы пасведчанняў губернатарам на пакупку зямлі ў Заходнім краі;
2) забарона католікам набываць нерухомасць у гарадах;
3) дазвол уладальнікам майаратаў прадаваць цераспалосныя землі;
4) заснаванне таварыства пакупнікоў маёнткаў у Заходнім краі.

VIII. На памешчыкаў рымска-каталіцкага веравызнання былі ўскладзены натуральныя павіннасці з:
1) 1863 г.;
2) 1865 г.;
3) 1866 г.;
4) 1870 г.

IX. Скасаванне 10 % кантрыбуцыйнага збору з маёнткаў памешчыкаў-католікаў адносіцца да:
1) 1863 г.;
2) 1865 г.;
3) 1884 г.;
4) 1897 г.

X. Права куплі ненаселеных земляў прадстаўнікі недваранскага саслоўя атрымалі ў:
1) 1795 г.;
2) 1801 г.;
3) 1861 г.;
4) 1863 г.

XI. Першае месца ў куплі зямлі дваране саступілі іншым саслоўям у:
1) 1873 г.;
2) 1882 г.;
3) 1892 г.;
4) 1896 г.

XII. Размясціце ў правільнай паслядоўнасці ад большага да меншага. У 1905 г. доля дваранскіх зямель у прыватным землеўладанні складала ў:
1) пяці паветах Віцебскай губерні;
2) чатырох паветах Віленскай губерні;
3) Магілёўскай губерні;
4) Мінскай губерні.



XIII. У 1909 г. кошт дваранскіх зямель у 5 заходніх губернях складаў звыш:
1) 100 тыс. рублёў;
2) 300 тыс. рублёў;
3) 500 тыс. рублёў;
4) 1000 тыс. рублёў

XIV. У парэформенныя гады назіраліся працэсы:
1) скарачэння дваранска-памешчыцкага землеўладання;
2) павелічэння дваранска-памешчыцкага землеўладання;
3) пераважнага ўнутрысаслоўнага пераразмеркавання зямельнай уласнасці дваран на падставе пазарынačных адносін;
4) пераўтварэння зямлі ў аб'ект куплі-продажу.

XV. У Беларусі дзейнічалі зямельныя банкі:
1) Варшаўскі акцыянерны зямельны;
2) Віленскі акцыянерны зямельны;
3) Дваранскі зямельны;
4) Сялянскі пазямельны.

XVI. Крэдыты ад Дваранскага зямельнага банка атрымоўвалі:
1) праваслаўныя дваране;
2) дваране-католікі;
3) дваране-лютэране;
4) фабрыканты.

XVII. Заснавальнікамі Віленскага акцыянернага зямельнага банка былі:
1) Э. Вальковіч;
2) М. Зубаў;
3) А. Платар;
4) П. Вітгенштэйн.

XVIII. Віленскі акцыянерны банк быў заснаваны ў:
1) 1865 г.;
2) 1872 г.;
3) 1883 г.;
4) 1885 г.

XIX. Найбольшы працэнт закладу ў банках прыватнай зямлі прыпадала на сярэдзіну:
1) 60–70-х гг. XIX ст.;
2) 70–80-х гг. XIX ст.;
3) 80–90-х гг. XIX ст.;
4) 90-х гг. XIX ст.– 1904 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ